Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 21 (50) Серада 29-га чэрвеня 1927 г. м. Вільня. Год II.

Беларускае Слова

Выходзіць раз у тыдзень — Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адраджэньне.— Т[illegible]яльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмократызм.—Ба[illegible]—Нацыянальная царква.— Краевая згода. Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на [illegible]
„ „ „ [illegible]
Заграніцу ўдв[illegible]

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр
„ сярод тэксту —25 гр
„ на апош. стар.—10 гр
за радок нонпарэля.

„Прыяц[illegible] Народу...

Пяць гадоў таму Беларускі Народ выбраў сваіх паслоў. А выбраўшы, паслаў іх у Дзяржаўны парлямэнт **ВЫКЛЮЧНА** на тое, каб яны споўнілі тыя свае шчодрыя абяцанкі, якія гэтыя — тагды яшчэ толькі **КАНДЫДАТЫ У ПАСЛЫ** — гэтак урачыста абяцалі Народу споўніць. Доўгіх, цяжкіх пяць гадоў Народ чакаў, што выбраньцы абароняць яго інтэрэсы, прынясуць палепшаньня немогчыма — цяжкай сялянскай долі.

Што-ж вышла? Чаго дачакаўся Беларускі Народ ад сваіх першых парляментарыяў?...

Перад усім таго, што яны падзяліліся і пабіліся на групы і групачкі, якія усе свае высілкі, усю сваю энэргію скіравалі на партыйную і нават пэрсональную барацьбу самымі ганебнымі спосабамі.

Пачатак гэтай самазабойчай барацьбе палажыла рука чалавека, імя і самая істота якога будзе фігураваць у гісторыі беларускага руху, як гнюсная і брудная пляма. Гэтак пад кіраўніцтвам Антона Луцкевіча Грамада падняла меч проціў усіх беларускіх групаў і партыяў, проціў польскага грамадзянства, проціў самае Дзяржавы.

Грамада мела на ўвазе не штодзенныя патрэбы Беларускага Народу, — ёй хадзіла аб рэвалюцыі, хадзіла аб „Сялянска-Работніцкам“ бальшавіцкім урадзе, хадзіла аб тое, каб чырвоныя таварышы з Менску працягнулі сваю лапу і на Заходнюю Беларусь...

Рэзультаты мы ведаем: няшчасьця і гора для Беларускага Народу, нарэшце турма і для саміх грамадаўскіх паслоў, дзякуючы чаму народ апынуўся адразу без паловы сваіх паслоў.

Другая пасольская група зазначыла, што ей перад усім ходзіць аб дабро Беларускага Сялянства. Гэтая група нават ярлык сабе прыляпіла яскрава сялянскі —„Беларускі Сялянскі Саюз“.

Што дала гэтая група Беларускаму Народу, а перад усім бел. сялянству, апякуном якога няпрошана зьявілася?

Поўны нуль!...

Грамада выразна рабіла стаўку на Бальшавіцкі Усход. Яна рашуча заявіла, што ані з правіцай, ані з лявіцай польскай ёй не па дарозе; яна праконана цьвердзіла, што толькі абурыўшы сучасны буржуазны лад Польшчы, можна што небудзь зрабіць для Беларускага Народу. Стаўка праступная, але выразная.

На тое мейсца уся палітыка Сель-Саюза—гэта ёсьць безпляновае і без усялякага здравага сэнсу шэлтай — балтайства: ад Усходу да Заходу, ад паездак і гутарак з Г. П. У. у Менску да флірту з польскай дэмократыяй, ад „грознай“ апазыцыі да Ураду ў сваім воргане да лазаньня па чорным сходам урадавых установаў і складаньня ганебных **ТАЙНЫХ МЭМОР'ЯЛАЎ**. Нарэшце ад дзікага шовінізму да лабызаньня, блёкаваньня і службы на пабегушках у расейскіх арганізацыяў, якія выразна і адкрыта нават духу беларускага ня прызнаюць.

Лёс паслоў Грамады прыкры. Аб сідзячых у турме ня сьлед гаварыць дрэнна, тым балей, што Грамада сваю бальшавіцкую стаўку праўграла.

Але паслы Сель-Саюзу яшчэ да гэтага часу капцяць беларускі небасхіл. Да гэтага часу робяць усе высілкі, каб баламуціць беларускі Народ, з адной, адзінай мэтай... **АТРЫМАЦЬ НОВЫЯ ПАСОЛЬСКІЯ МАНДАЦІКІ!...**

Тое, што Ярэміч і Рагуля збагаціліся за свае пасольства, накупляўшы сабе і дамкоў, і зямелькі, і сенакосу — гэтага мала. Хочацца зноў мець мандацік, каб яшчэ трошкі дакупіць і таго і другога... А Народ? што ім Народ!

Хто ня ведае, што балючай скулай беларускага селянства быў і да гэтага часу ёсьць—валасныя **РАДЫ**, няведама калі, няведама як выбраныя. І вось раптоўна ўрад аб'явіў новыя выбары рад гмінных. Гэтае распараджэньне захапіла народ няпрыгатаваным. Народ ня меў ані правадыроў, ані інструкцыяў, ані выбарчай літэратуры, законаў і г. д **АБАВЯЗКАМ** сьвятым **ПАСЛОЎ** было кінуць усе сілы і усю тэхніку на вёску, **ДАПАМАГЧЫ СЯЛЯНСТВУ** выбраць добрыя, беларускія, валасныя рады, ад якіх залежыць усё вясковае жыцьцё сяляніна.

Так **ПАВІННА** была быць, але Сельсаюз не знайшоў ані сілы, ані сродкаў, ані ахвоты, каб выпусьціць хаця-бы адну адозву для беларускай вёскі, хаця-бы некалькі тысячаў эгзэмпляраў закону аб выбарах да валасных радаў, не гаворачы ўжо аб працы на мейсцох, разсылцы інструктароў і г. д Ён **АНІ ЧАГУСЕНЬКІ** не зрабіў у часе выбараў для вёскі таму скажам зусім выразна, бо ня меў з гэтага безпасрэдняй, рэальнай карысьці для сябе... Тут-жа не хадзіла аб гэтак дарагія і ганаровыя пасольскія мандаты для п п. правадыроў, а хадзіла **ТОЛЬКІ** аб далёкія **ВЯСКОВЫЯ**, валасныя рады...

На тое месца мы бачым, што і энэргія, і сродкі, і літэратура, і **ІНСТРУКТАРЫ** у Сельсаюзе з'явіліся адразу, калі пытаньне зайшло аб здабыцьці хаця-бы аднаго мандату, гэтак сама дарагога і ганаровага, у Віленскім Магістрату. Сам лідэр саюзу Ярэміч йшоў 3-м кандыдатам на раднага, бо вядома, што пры заняцьці адпаведнага мейсца, радны адтрымлівае гэтак, як і пасол сойму, да **1,000 ЗЛОТЫХ У МЕСЯЦ...** Пайшоў, аб'яднаўся з тымі каго ня даўна лаяў, забыў аб усіх сваіх абавязках прад вёскай, ідзе у той час, калі ў адных мейсцох прахадзілі адны палякі, як у пав. Віленска Троцкім, ў другіх — грамадаўцы і крымінальныя элемэнты. Забыў і аб сваім сумленьню „сялянскага“ пасла. Пайшоў, нічога ня думаючы і... прайграў, праваліўся і мандаціка магістрацкага раднага не дастаў...

У папярэднім нумары мы падавалі заметку аб тым, што Ярэміча, Рагулю і Більдзюкевіча выключылі з Сялянскага Саюзу. Ясна, што Рагуль-Ярэмічаўскі Сельсаюз рушыцца і разлятаецца фактычна ў шчэнт. Але мы думаем, што моральна Сельсаюз у вочох беларускага сялянства памёр пасьля сваіх адносінаў да **ВЯСКОВЫХ** выбараў у валасныя рады, даказаўшы адначасна поўнае свае банкруцтва, праваліўшыся на выбарах у Віленскі Магістрат.

ВЫБАРЫ ДА ГМІННЫХ і МЕСЦОВЫХ САМАЎРАДАЎ.

СЛОНІМСКІ ПАВЕТ.

ГМІНА КАЗЛОЎШЧЫНА — было 4 сьпіскі.

N 1 — „гурткоўскі“	— дастаў	3	мандаты.
N 2 — нацыянальны	„	5	„
N 3 — польскі	„	2	„
N 4 — мешаны	„	2	„

ГМІНА МІЖАВІЧЫ — было 8 сьпіскаў.

N 1	шляхоцкі умяркаваны — дастаў	1	мандат.
N 2	нацыянальныя	1	„
N 3	нацыянальныя	1	„
N 4	нацыянальныя	1	„
N 5	нацыянальныя	1	„
N 6	нацыянальныя	—	
N 7	нацыянальныя	1	„
N 8	„грамадаўскі“	6	„

ГМІНА ЧАМЭРСКАЯ.

Падчас выбараў „грамадаўцы“ дэманстрацыйна пакінулі кватэру выбараў і запратэставалі проці выбранай рады у склад якой ўвайшлі амальшто ня ўсе са сьпіску нацыянальнага.

ГМІНА КАСТРОВІЧЫ.

90 проц.—грамадаўцы і 1 з нацыянальнага сьпіску.

ГМІНА СТАРАВЕСЬ.

25 проц.—палякі, 40 проц. — умяркаваныя і 35 проц. грамадаўцы.

ГМІНА ДЗЯРЭЧЫН.

40 проц.—жыды, 30 проц.—грамадаўцы і 30 проц.—палякі і беларусы.

ГМІНА КУРЫЛОВІЧЫ.

60 проц.—грамадаўцы, 40 проц —умяркаваныя белар. і 1—паляк.

ГМІНА ДЗЕВЯТКОВІЧЫ.

70 проц.—грамадаўцы, 25 проц.—умяркав. белар і 5 проц. шляхта.

ГМІНА РАГОТНА.

40 проц.—грамадаўцы, 30 проц. умяркав. белар. 20 проц. палякі і 10 проц.—жыды.

ГМІНА БЫТЭНЬ.

40 проц.—умярк. белар., 25 проц. грамадаўцы, 20 проц. жыды і 15 проц. асаднікі.

ГМІНА ЖЫРАВІЦЫ.

40 проц.—умяркав. белар., 40 проц. грамадаўцы, 20 проц.—асаднікі.

МІЖАВІЦКІ РАЕН.

Раён Міжавіцкае воласьці быў падзеляны праз Валасны Выбарчы Камітэт на 6 абводаў—1) ў Міжэвічах, 2) ў Острове, 3) ў В. Кракотцы, 4) ў Селявічах, 5) ў Плаўскіх і 6) ў Клепачах.

Склад Камітэту — Старшыня і 4 сябры.

Выбары адбыліся 13 VI адначасова у ваўсіх абводах.

У Селявіцкі абвод уваходзілі вёскі: Селявічы, Юхневічы, Варонічы і Ячэвічы і праз Камітэт было вызначана 30 мандатаў.

Трэба адзначыць, што вёскі Юхневічы і Варонічы, гэта запраўдныя гнёзды „грамадаўскія“ і прышлося цяжка змагацца за мандаты. Іншыя абводы, апрача Плаўскіх, гэтак сама пад ўплывам „Грамадаўцаў“ і правялі некалькі сваіх кандыдатаў, але пасярод іх ўжо адчуваюцца сымпатыкі нашае ідэолёгіі.

У Селявічах, дзякуючы сьвядомасьці жанчын (прыходзілі на галасаваньне нават маючыя 60—65 гадоў) адтрымана 18 мандатаў, а ў Яцэвічах, Варонічах і Юхневічах — 12 ня гледзючы на тое, што гэтыя вёскі разам ўзятыя ёсьць у 2 разы большыя чым Селявічы, а мы перавысілі грамадаўцаў.

Выбары ў Радныя адбыліся 19 VI у памешканьні Межавіцкае воласьці, а 12 гадзіне. Сьпіскаў было 8, з іх „Грамадаўскі“—1, пагляду „нацыянальнага“—5 і „шляхоцкіх“—2.

Выбрана 12 радных, з іх палова са сьпіску нацыянальнага, а палова „Грамадаўцаў.

Б-я.

КЛЕЦКІ РАЕН НЯСЬВІЖСКАГА ПАВ.

18—21 гэтага месяца у раёне Клецка адбыліся выбары у валасныя самаўрады. Дзякуючы „Беларускаму Слову“ і працы Цэнтральнага Белар. Нац. Выбарнага Камітэту, сяляне былі у свой час паведамлены аб выбарах і даведаліся аб правілах выбараў. Хаця часу і не надта было шмат, але усё-ж такі сялянства пасьпела сарганізавацца і пад кірункам інструктараў Ц. Выбарнага К-ту з поўнай сьвядомасьцю пайшлі на выбары.

У чатрох—першых гмінах рэзультаты выбароў наступныя:

1. Сіняўка	— 12	з іх 10 бел	1 пал.	1 жыд.	
2. Лань	— 10—„—	6—„—	4—„—	—	
3. Клецк	— 10—„—	8—„—	2 „—	—	
4. Грыцэвічы	10—„—	6—„—	4 „—	—	

Заклік Цэнтральнага Камітэту да таго, каб састаўляўся толькі адзін сьпісак, бо іначай могуць прапасьці галасы — нажаль ня ўсюды выпаўняецца. Сярод кандыдатаў пападаюцца асобнікі, якія хаця-ж цаной зьмяншаньня агульнага ліку мандатаў, стараюцца правесьці у Рады саміх сябе і складаюць асобныя сьпіскі. Прыклады, да чаго гэта вядзе-даюць рэзультаты выбараў вышэй пададзеных валасьцёў: У Сіняўцы быў 1 сьпісак — выбрана на 12 м ст — 10 беларусаў.

У Клецку хаця была спроба сарваць адзіны фронт і былі зложаны 3 сьпіскі— але у селі сяляне разабраліся і галасавалі на сьпісак нацыянальны, дзякуючы чаму выбрана з 10-х 8 радных беларусаў.

Грамадаўскія сьпіскі сабралі усяго на два сьпіскі 7 галасоў і гэткім чынам не атрымалі аніваднаго мандату. Каб ня было гэтых другіх сьпіскаў—беларусы атрымалі б пэўна яшчэ адзін мандат. У Лані таксама было 3 сьпіскі. Дзякуючы гэтаму прайшло толькі 6 нашых радных. Рэшта-ж галасоў па усім 3-м сьпіскам было больш 10 і значыцца **АДЗІН ПЭЎНЫ МАНДАТ** прапаў.

Тое самае даецца заўважыць і па іншым гмінам.

Адначасна з гэтым трэба адзначыць узрост сьвядомасьці сярод сялянства і поўнае зразуменьне важнасьці выбараў. І хаця розныя крыкуны-дэмагогі і стараюцца рознымі пекнымі абецанкамі ды гучнымі лёзунгамі разьбіць сялянскую еднасьць па партыйным аднакам—гэта ім ня удаецца. Пазналіся сяляне на „хварбаваных лісах“ і даюць адпор абецаючым „рай“ У Клецкім раёне выбраны усе умеркаванага кірунку і прыхільнікі Белар.Нац. Рады. Грамадаўцы хаця-ж і стараліся, ідучы пад гук заклікаў папы—Луцкевіча,—разьбіць агульны нацыянальны фронт— з сорамам праваліліся, сабраўшы на свае сьпіскі усяго па некалькі галасоў.

Пісьмо

У Цэнтр. Бел. Нац. Выб. Кам.

У сувязі з выбарамі у нашу мейсцовую Раду, якія адбудуцца дня 17. VII г. г. просім выслаць нам імфармацыяў і парад: як весьці, выбарчую кампанію. Пажадана будзе, каб хто колечы прыехаў да нас, бо як відна з вашай газ. „Бел. Слово“ на павет Ваўкавыскі няма інструктароў. Просім, з намі ўвайсьці у кантакт з мэтай правядзеньня беларусаў у Радныя м. Сьвіслач. Па атрыманьні гэтай пачтоўкі просім безадкладна выслаць выбарчай літэратуры і г. д

АДКАЗ. Газэты высылаем. Інструкцыя па выбарам у мейсцовыя Рады друкуецца і будзе Вам выслана. Зараз-жа выезджае да вас прадстаўнік Цэнтр. Камітэту.

Беларускія арганізацыі у выбарчай акцыі.

У Вільні 19 чэрвеня адбыліся выбары у Віленскую мясцовую Раду (Магістрат). З тае прычыны, што падчас выбараў у Віленскі магістрат падасьпелі выбары у валасныя рады усей Віленшчыны і Наваградчыны, Бел. Нац. Рада пастанавіла ўсе свае сілы скіраваць на дапамогу шырокім сялянскім масам, якіх выбары захапілі неспадзеўкі і зусім ня прыгатаванымі. Як вядома быў зараз-жа з ініцыятывы Бел. Нац. Рады у паразуменьню з Бел. Нац. Партыяй створаны Беларускі Нацыянальны Выбарны Камітэт. Камітэт зараз-жа прыступіў да дзейнасьці.

Былі выдрукаваны і разасланы па ўсіх беларускіх кутках дзьве прадвыбарчыя адозвы у якіх сялянству тлумачыліся ўсе правілы выбараў, правы і абавязкі выбаршчыкаў, каго і як выбіраць і г. д. Быў перaтлумачаны з польскага і разасланы закон аб выбарах да гмінных радаў. Былі разасланы з Цэнтру і пры-

Палітычны агляд.

Варшаўскі выстрал Кавэрды і новы выбух чырвонага тэррору ў С. С. Р. Р. зусім адцягнулі агульную ўвагу ад нядаўна закончыўшайся чарговай сэсіі Рады Лігі Народаў у Жэнэве. І, калі усё-ж такі прыходзіцца застанавіцца над гэтым фактам, дык толькі дзеля таго, што на жэнэўскім зьездзе міністраў заграпічных справаў тых дзяржаваў, якія уваходзяць у склад Рады Лігі Народаў, расейскае пытаньне займала першае мейсца. Ужо вайшло ў звычай, што паважнейшыя праблемы сьвятовай палітыкі абгаварываюцца не на

афіцыяльных, пленарных паседжаньнях Лігі Народаў, а за іх кулісамі.

Гэтак сама было і на гэты раз. Чарговыя пытаньні, стаяўшыя на дзенным парадку, як пытаньне аб тым, чы разбурыла Нямеччына частку сваіх усходніх укрэпленьняў, аб зьмяншэньні акупацыйных гарнізонаў у Прырэйнскай вобласьці, Клайпэдзкі, нямецка-літоўскі канфлікт і г. д., прайшлі зусім незаметна, ў той час, як уся ўвага удзельнікаў зьезду і прысутных журналістаў была скіравана на „расейскае" пытаньне ў зьвязку з англійска-радавым разрывам адносінаў і новым тэррорам у С. С. Р. Р.

Гэтаму пытаньню ў цэлым яго абыйме былі удзелены дзьве канфэрэнцыі, адна „пяці", а другая „шасьці" міністраў заграпічных справаў, на жаль бяз удзелу польскага міністра Залескага, хаця гэта пытаньня больш ўсіх латычыцца Польшчы. З афіцыяльных камунікатаў, пададзеных у прэсе аб гэтых прыватных канфэрэнцыях, вынікае, што разглядалася

пытаньне аб агульнай барацьбе з бальшавізмам.

Чэмбэрлен, падняўшы гэта пытаньне і кіраваўшы канфэрэнцыямі, заявіў, што Англія ў сутнасьці нічога ня мае проці істнаваньня ў Расеі радовага ураду, як гэтакага. Яна толькі бароніцца проці антыдзяржаўнай акцыі III інтэрнацыянала, які неразрыўна зьвязаны з радавым урадам. А пакуль апошні падтрымлівае III інтэрнацыянал, дык гэта абаронная барацьба Заходніх, культурных дзяржаваў скірована і проці яго. Усе прысутныя дзяржавы, невыключаючы нават Нямеччыны, зусім згадзіліся з паглядамі Англіі, што

наступіў момэмт для аб'яўленьня адкрытай вайны III інтэрнацыяналу.

Праўда пакуль не дайшло да стварэньня агульнага фронту для барацьбы з камунізмам. Кожнай дзяржаве дадзена свабода дзеяньня. І ў гэтым некатарыя скэптыкі і пэсымісты бачаць фіяска англійскай, антыбальшавіцкай палітыкі. Але гэта зусім абмылковая апінія. Ужо адзін той факт, што на міжнародный арэне было паднята пытаньне аб патрэбе і неабходнасьці барацьбы з III інтэрнацыяналам, як агульнаю небясьпекаю, сьведчыць аб тым, як рэзка зьмянілася пазыцыя Захода ў адносінах радавай Расеі пасьля апошніх падзеяй у Кітаі, Лёндане і Расеі. Яшчэ нядаўна бальшавіцкая дэлегацыя даводзіла ў Жэнэве на эканамічнай канфэрэнцыі патрэбнасьць супольнага супрацоўніцтва камуністычнага ладу з капіталістычным на эканамічным грунце, а праз некалькі дзён у той жа Жэнэве другая міжнарадовая канфэрэнцыя выносіць пастанову аб неабходнасьці супольнай барацьбы з III інтэрнацыяналам, што ў сутнасьці значыць барацьбу проціў самай радавай улады ў Расеі.

Пазыцыя радаў так пахісталася на Заходзе,

што нават зьмяніліся адносіны да іх немцаў, якія мусяць падпарадкавацца агульнаму, антыбальшавіцкаму настрою культурнага сьвету. Раней вельмі прыхільная да бальшавікоў, як сваіх хаўрусьнікаў, нямецкая прэса на гэты раз аднеслася да іх вельмі студзёна. Уся апрача камуністычнай, прэса рэзка асудзіла новы, чырвоны тэррор у Расеі. І, калі Чычэрын намерываўся прыехаць да Бэрліна перад сэсіяй Рады Лігі Народаў, каб падрыхтаваць Штрэзэмана, дык бэрлінская прэса адкрыта выражала незадаваленьне, прадбачачы нетасоўнасьць гэтай візіты, якая толькі магла зашкодзіць уласным нямецкім інтарэсам. І ў гэтым немцы не абмыліліся.

Прайшоў час, калі немцы выігрывалі, выступаючы ў ролі пасрэдніка між Усходам і Заходам.

Яшчэ да апошняга часу яны атрымлівалі аднолькавыя карысьці як з Лёкарна і Туары, гэтак сама і з Рапалло і Бэрлінскай згоды. Але на апошняй сэсіі Рады Лігі Народаў Штрэзэману было выразна паказана, што Захад зусім не патрэбуе гэтага пасрэдніцтва ад немцаў. Пытаньня аб зьмяншэньні акупацыйнага гарнізона ў Прырэйнскай вобласьці, і зьмяненьні пляна Даўса былі пакінуты Радаю Лігі бяз увагі. Але на гэтым яшчэ не канец. Калі толькі немцы не падпарадкуюцца Англіі і Францыі пры іх барацьбе з бальшавізмам, дык могуць рызыкаваць вельмі няпрыемнымі скуткамі гэтай дваабліччнай палітыкі.

Англія мае вельмі вялікія козыры для уздзеіньня на Нямеччыну.

Немцы не павінны забываць таго, што палёгкі ў выплаце кантрыбуцыяў і атрыманьні заграпічных пазык, галоўным чынам у Амэрыцэ, яны атрымалі толькі дзякуючы пратэкцыі Англіі. А цяпер, пры поўнай згодзе англійска-амэрыканскіх поглядаў на бальшавіцкае пытаньне, голас Англіі мае яшчэ большую вагу у Амэрыцэ. Варта толькі Англіі ужыць свой ўплыў на амэрыканскіх і сваіх уласных банкіраў, каб устрымамалі далейшыя пазыкі для Нямеччыны, як апошняя можа аказацца ў вельмі прыкрай сытуацыі пры яе сталым, ад'емным, гандлёвым балянсе. Гандлёвы дэфіцыт Нямеччыны кожны месяц дасягае 300 — 350 мільёнаў зл. Гэты недабор пакрываецца пастаяннымі новымі пазыкамі у Амэрыцы і самай Англіі. Толькі дзякуючы гэтаму курс нямецкай маркі стаіць моцна і Нямеччына лёгка пераносіць эканамічны крызыс.

Але нажаль Нямеччына не разумее яшчэ таго, якую яна вялікую робіць палітычную абмылку, прадаўжая сядзець адначасна на двух крэслах, — лёкарнскім і рапальскім. І, як відаць з прамовы нямецкага міністра заграпічных справаў, у рэйхстаге пасьля жэнэўскай сэсіі Рады Лігі Народаў, Нямеччына не адмовілася ад гэтай няпрошанай ролі пасрэдніка між Заходам і Ўсходам. Якое становішча займе Англія адносна ўпартага нехаценьня немцаў зыйсьці з пазыцыі „дабражадацельнага нэйтралітэту", невядома. Але, што датычыцца Францыі, дык апошняя не знаходзіць патрэбным хаваць свае карты пад стол, маючы дачыненьне з гэткім партнёрам, які дапускае ўсе сродкі пры дасяганьні пастаўленых мэтаў

Гэта зусім адкрыта выразіў Пуанкарэ ў сваей манавільскай прамове,

папярэдзіўшай прамову Штрэзэмана, якая зрабіла вельмі няпрыемнае ўражаньне ў Бэрліне.

Францускі прэм'ер Пуанкарэ бяз усякага сораму заявіў, што

пасьляваенная Нямеччына, як і даваенная, даказывае яе благую волю.

Нямецкія нацыяналісты не праяўляюць шчырага жаданьня захаваць мір ні на Усходзе, ні на Заходзе Эўропы. У канцы ён заявіў, што сьвет толькі тады аднясецца з даверрам да Нямеччыны, калі яна адкрыта, шчыра і аканчальна адрачэцца ад Эльзаса і Лётарынгіі, пераглядзіць сваю палітыку на Эўрапэйскім Усходзе, выпаўніць усе пастановы ад 1 лютага г. г., ліквідуе свае мілітарыстычныя арганізацыі і зьнішчыць свае крэпасьці на граніцы Польшчы.

Адсюль відаць, што Францыю не здавальняюць папяровыя абяцанкі немцаў падтрымаць добрасуседзкія адносіны і супрацаваць у падтрыманьні агульна эўрапэйскага міру.

Францыя патрабуе ігры ў адкрытыя карты і рэальнага супрацоўніцтва,

ў якім ня можа быць мейсца для ня-

цягнуты на мейсцох да працы інструктары. Часу было страшэнна мала, але усюды дзе працаваў „Нацыянальны Выбарны Камітэт"— у валасныя рады прайшлі добрыя, салідныя, праўдзівыя грамадзяне і шчырыя, сьвядомыя беларусы. І мы лічым, што Бел. Нац. Рада і маладая Беларуская Нац. Партыя свой абавязак споўнілі.

У гэты час Бел. Сельсаюз браў ўдзел у выбарах да Віленскай Мясцовай Рады. Мы самі не бралі ўдзелу у выбарах у Вільні і дзеля гэтага, АНІ ВОДНЫМ СЛОВАМ НЕ ПЕРАШКОДЗІЛІ выбарчай працы беларусам у Вільні, якія ўвайшлі ў блёк з расейскімі віленскімі арганізацыям!— „расейскім добратворчым Т-вам" і „РАСЕЙСКІМ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ОБ'ЕДНАНЬНЕМ". Так, мы ДА ВЫБАРАУ не забіралі голасу, але цяперака можам і павінны!

Мы лічым безумоўна этычна не дапусьцімым еднацца хаця-ж у блёку беларускай нацыянальна-сялянскай арганізацыі (за якую выдае сябе Сельсаюз) з арганізацыямі і групамі, якія ня прызнаюць ані беларускага нацыянальнага руху, ані самага беларускага народу, як нацыі, нарэшце арганізацыі (Рус. Нар. Об'ед.) якая па свайму персанальнаму складу у значным ліку складаецца з абшарнікаў. З другога боку форма блёку беларусаў з расейцамі у б. сталіцы Беларусі аказалася ганьбячай нацыянальны гонар беларусаў. Беларусы адтрымалі у зблекованым беларуска-расейскім спіску ТОЛЬКІ 3-яе МЕЙСЦА, зусім безнадзейнае. Толькі пустагаловы манцёр заняўшы гэтад 3-яе безнадзейнае мейсца спадзяваўся трапіць фуксам да магістрату, як калісь трапіў да Сойму.


Грамадаўцы зрабілі зусім інакш і трэба прызнаць, больш пасьледавацельна і практычна. Яны проста пайшлі з інтэрнацыянальным комуністычным сьпіскам і адтрымалі адзін мандат. Папа, па гэтаму сьпіску нікому ня ведамы нейкі Крук.

Гэткім чынам па беларускаму нацыянальнаму сьпіску у Віленскі магістрат не трапіла ані воднага беларуса, у той час як літоўцы, якіх у Вільні значна меньш чым беларусоў атрымалі па свайму нацыянальнаму сьпіску адзін мандат.

Баючыся прызнацца у гэткім скандальным правале Сельсаюз у сваім воргане „Сял. Ніве" абвясьціў, што па расейска-беларускаму сьпіску прайшоў адзін беларус — сэн. Багдановіч!.. Сельсаюз не атрымаўшы ані воднага мандату, хоча адыграцца на Багдановічу. Мы нічога ня маем проціў паважанага п. сэнатара Багдановіча, але хтож у Вільні ня ведае, што сэн. Багдановіч беларус па непаразуменьню.

А ворган віленскіх расейцаў „Утро" зусім выразна і ясна зазначыў аб перамозе РАСЕЙЦАЎ, якія правялі у магістрат на № 1. РАСЕЙЦА Багдановіча. Сказала аб гэтым і „За Свободу". Сконфужаныя, да нельга сельсаюзьнікі да свайго скандальнага правалу дадалі яшчэ ашуканства выдаючы за свайго беларуса таго, каго увесь расейскі віленскі лагер лічыць сваім лідэрам.

ЮЛЬЯН СЛАВАЦКІ.



4 верасьня 1809 г. — 3 красавіка 1849 г.

Сярод кніжак.

(Крытычны агляд віленскіх беларускіх літэратурных навінак 1926 г.).

(Глядзі № 16).

III. „Śmiech nia hrech"—зборнік гумарыстычных вершаў Ст. Станкевіча.

Зборнік *„Сьмех ня грэх"* Ст. Станкевіча (першы гэтага аўтара) — ня выяўляе вялікіх літэратурных вартасьцяў: зьмест вершыкаў — прымітыўны, вясковы; рытмоўка — нескамплікаваная, пры гэтым, выключна дзеля захаваньня разьмеру ў паасобныя радкі устаўлены лішнія, невялічкія слоўцы, як: там, ён, ўжо і г. п.

Ня гледзячы ўсё-ж такі на скромны ровень зьместу, дзякуючы шчадрацe прыватнага выдаўца п. Яцыны зборнічак выданы, як на сучасныя беларускія умовіны, гэтак багата, што не адзін, на'т першарадны беларускі пісьменнік мог бы яму пазайздросьціць.

А цяперака прыгледзімся крыху бліжэй да гэтага зборніку. Друкаваны лацінкаю, на добрай глянцаванай паперы, у фармаце павялічанай 16-ткі, ён шырока абыймае 62 старонкі, без эканоміі мейсца раскіданага друку; на спэцыяльную ўвагу заслугоўвае вокладка з моцнай гладкай паперы, упрыгожаная він'еткай сьмяючагася хлапца. На жаль трэба адзначыць, што малюнак ня зусім удаўся, бо хлапец гэты мае нейкісь ідыёцкі, тупы выраз твару, а гэта тым-больш няпрыемна, што за жывы ўзор да малюнку паслужыў, здаецца, мастаку адзін з рэдактараў "Маланкі"!

Увесь зборнік падзеляны на 5 паасобных аддзелаў: І-шы *„Меставы гумар"*; ІІ-гі *„Вясковы гумар"*; ІІІ ці *„Палітычны гумар"*; ІV-ты *„Розныя жарты"* і V-ты *„Апавяданьні"*

У аддзеле І-шым, *„Меставы гумар"*, найлепшымі будуць два першыя вершыкі: *„Конь і аўтобус"* (ст 5) і *„Сучасная мода"* (ст. 6); затое зьмешчаная у гэтым-жа аддзеле *„Маляваная лаўка"* (ст. 8), мае занадта наіўны зьмест і слабы досьціп, каб яе наогул варта была зьмяшчаць

У аддзеле ІІ гім вызначаным наогул сваім вясковым прымітывізмам, лепшым ад іншых будзе забаўны вершык *„Растлумачыў"* (ст. 28).

У аддзеле ІІІ-цім *„Палітычны гумар"* найлепш удаліся аўтару тры першыя вершыкі, поўныя едкае сатыры на сучасныя абставіны беларускага жыцьця ў Польшчы. Гэта—*„Нехта—нейкі"...*" (ст. 33); *„Госьці"* (ст. 34) і слабае з боку літэратурнага, але адметнае сваім досьціпам *„Не спадабаліся!"* (ст. 35). Іншыя вершы гэтага аддзелу — даволі-ткі слабыя.

У аддзеле ІV-тым *„Розныя жарты"*, два пераклады баяк Крылова ня надта ўдаліся аўтару; лепш выйшла *„Каханьне"* (ст. 49), але думка вершу, што бяз грошаў няма каханьня, -- лішне ўжо цынічная!

Увесь V ты аддзел *„Апавяданьні"* займае *„Казка пра дзеда ды бабу"* (ст. 53 — 62). Казку гэту, пісаную вершам, сьмела можна аднясьці да лепшых твораў зборніку: зьмест яе жывы; верш — гладкі; стыль сакавіты, дзеля чаго чытаецца яна лёгка і з прыемнасьцю,

Гэтымі славамі мы маглі-б і закончыць агляд зборніку, адкладаючы больш падрабязную характэрыстыку творчасьці аўтара да выхаду іншых яго твораў, але дзеля таго, што з аднаго боку няма ведама, калі гэтыя іншыя творы будуць выдадзены, з другога-ж, — бяручы пад увагу тое, што са зьместам іх мы мелі ўжо магчымасьць дэтальна азнаёміцца — зробім гэту ацэнку цяпер.

Станіслаў Станкевіч—чалавек у беларускай літэратуры ня новы; піша ён вершы беларускія ўжо каля 10 гадоў, выяўляючы ў іх сталае разьвіцьцё сваіх прыроджаных здольнасьцяў. Паасобныя творы ягоныя апошнімі гадамі зьмяшчалі рожныя беларускія календары ды газэты. Акрамя выдадзенага зборніку гумарыстычных вершаў п. н *„Сьмех ня грэх"*, аўтар мае ўжо зусім гатовы да друку, даволі вялікі зборнік вершаў п. н. *„З майго ваконца"*. Зборнік гэты, даволі цэнны з боку літэратурнага, абыймае вершы: патрыятычныя, любоўныя, прыродаапісальныя, з вясковага жыцьця, пераклады і іншыя. Хуткае выданьне іх было-б пажаданым!

Вось-жа на падставе гэтых вершаў Ст. Станкевіча належыць аднясьці да тае шматлікае катэгорыі другарадных, беларускіх пісьменнікаў, да якой належыць: Гальяш Леўчык, Янка Быліна, Зязюля, Я. Бэкіш і шмат іншых беларускіх песьняроў і пісьменнікаў, пры гэтым мейсца ягонае сярод іх далёка не апошняе, бо творы Ст. Станкевіча бязсумліву лепшыя ад Зязюліных, пераважна ня горшыя ад Быліных, а ня раз лепшыя і ад вершаў Леўчыка, які маючы наагул больш амбіцыі, чым таленту, ад часу прылучэньня свайго да сэктанства, зусім зьбіўся з панталыку!

IV. „Дэман"—поэма М. Лермантава; пераклаў М. Краўцоў.

Макар Краўцоў ёсьць вядомы, як слабы фэльетоніст і сярэдняй рукі поэт і літэратурны крытык, але за тое ён зьяўляецца выдатным перакладчыкам шэдэўраў расейскае поэзыі на беларускую мову, і у гэтай галіне мае бязсумліва вялікія заслугі перад беларускай літэратурай (ня кажам тут зумысьля аб ягоных перакладах прозай, як аб рэчы менш важнай, аб якой, акрамя таго, будзе гутарка крыху ніжэй.)

Варта тут яшчэ адзначыць, што дзьве новэллы, зьмешчаныя пару гадоў назад у „Грамадзкім Голасе" і падпісаныя праз Эдмунда Бюрбэкля, здаецца, гэтак-жа выйшлі з пад пяра М. Краўцова. Новэллы гэтыя, якіх назоваў ня можам сабе у сучасны момант успомніць, выяўляюць не малую літэратурную вартасьць і заслугоўваюць на тое, каб іх выдаць асобнай кніжачкаю.

Але вернемся да перакладаў вершам.

Ужо першы з іх *„Мцыры"* М. Лермантава, зьявіўшыся яшчэ у 1924 годзе ў Вільні, зьвярнуў нашу ўвагу сваей дасканальнасьцю як з боку гучнасьці верша, так і блізасьцю да арыгіналу. Калі і можна што закінуць гэтаму перакладу, дык толькі самую драбніцу: у некалькіх мяйсцох зьмест ёсьць крыху імглісты і няма ведама, да каторай фразы адносіцца дадзены радок. У іншых зноў частках, дзеля захаваньня разьмеру, увапхнуты непатрэбна лішнія словы, якія нямала псуюць ўражаньне сваей прыпадковасьцю і штучнасьцю, гэтак-жа здараецца, што перакладчык ужывае падчас неадпаведных, у даным выпадку, слоў. Але, паўтараем гэта драбніцы!

Яшчэ лепш апрацаваны перакладчыкам другі шэдэўр М. Лермантава — несьмяротная поэма *„Дэмон"*. Пераклад гэты старанна выдала Беларускае Выдавецкае Т-ва у Вільні. Займае ён 44 старонкі паменшанае васьмёркі. Заганы, якія можна-б было зрабіць гэтаму перакладу, будуць зусім аналёгічныя з тымі, якія мы пасавалі да перакладу папярэдняга, з той толькі рожніцай, што хібаў у ім значна менш і выяўляюцца яны ня гэтак войстра.

Адзначым тутака на пасьледак, што М. Краўцоў яшчэ два гады назад меў намер перакласьці на беларускую мову усяго *„Евгенія Онегина"* але штосьці аб гэтым ня чутно! Вось-жа раілі-б М. Краўцову, заместа брахлівых напасьцяў у рожных „Днях" ды „Маланках" на нялюбых яму асобаў, заняцца лепш гэтым перакладам, які-б бязсумліўна дадаў новага бліску ягонаму, літэратурнаму іменьні.

ЧЫРВОНЫ ТЭРРОР У ССРР.

Страшны лес вязьняу у С.С.Р.Р.

З Гэльсінфорсу паведамляюць аб нячуваных мучэньнях вязьняў у бальшавіцкіх турмах. Гэтак у ліку 23 замардаваных у Маскве, пасьля забойства Войкава, знахадзіўся быўшы палкоўнік расейскай арміі фінляндзец Эльвэнгрэн. Цяпер выясьнена, што Эльвенгрэн быў замардаваны некалькі тыдняў да забойства Войкава. Ен быў арыштаваны некалькі месяцаў таму назад. Каб прымусіць яго даваць пак заньні, чэкісты падверглі яго страшэнным мукам. А, калі і гэта не памагло, дык яго прыкавалі да чалавечага трупу, некалькі дзён няшчасны мусіў сядзець над разлагаючымся, сьмярдзючым трупам, пакуль не звар'яваў, тады яго растрэлялі.

КРЫВАВЫ БАЛЯНС ЗА АПОШНІ ТЫДЗЕНЬ.

У зьвязку з новым террорам у С.С.Р.Р. на гэтых днях высланы на Салавецкія вастравы 50 быўшых афіцэраў. У Кранштадзе растрэляна 9 марскіх афіцэраў, у Менску — 27 асобаў і ў Пскове — 17. Апрача гэтага выслана ў Нарымскій край на ссылку 650 асобаў.

Барацьба з рэлігіяй у С. С. Р. Р.

У Ноўгарадзе месцовы саюз „бязбожнікаў" атрымаў ад радавых уладаў дазвол на закрыцьце аднэй з найстарэйшых праваслаўных сьвятыняў у Расеі — сабору сьв Сафіі Сабор закрыты, а вынесеныя з яго ўсе царкоўныя рэчы былі зложаны ў кучу на пляцу перад саборам і спаляны. У часе гэтага зьдзекаваньня над сьвятыняю стаяў атрад чырвонай арміі, бо народ стараўся перашкодзіць гэтаму сьвятатацтву.

Арышты сярод сваіх.

У Петраградзе зроблены арышты сярод „комсамольцаў" камуністычнай партыі петраградзкага гарнізону. У ліку арыштаваных маюцца дзьве асобы з „асобага атраду Г.П.У.

Усе пратэстуюць.

Францускам Ліга Правоў Чалавека і Грамадзяніна, складаючася выключна з сацыялістаў і радзікалаў, вынясла рэзкі пратэст проці чырвонага тэррору ў С.С.Р.Р.

БЭЛА — КУН.



Быўшы дыктатар вэнгэрскай радавай рэспублікі. Пасьля разгрому вэнгэрскіх камуністаў ён уцёк да Масквы і быў нейкі час дыктарам у Крыму. Цяпер звар'яваў і зьмешчаны у шпіталь для вар'ятаў.

НАВАТ СВАЕ ПРАТЭСТУЮЦЬ.

На паседжаньні галоўнай рады англійскай работніцкай партыі вынесена рэзалюцыя, пратэстуючая проці забойства бальшавікамі, нявінных і неадказных за сьмерць Войкава, асобаў.

І ТУТ ФІЯСКА.

Томскі на падзвычайным паседжаньні англійска-расейскага камітэта прафэсыянальных саюзаў у Бэрліне прапанаваў неадклад на склікаць канфэрэнцыю галоўных комітэтаў англійскіх і радавых праф. саюзаў. На гэтай канфэрэнцыі павінна было разглядацца пытаньне аб англійска-радавым канфлікце. Англійскія прадстаўнікі камітэту перадалі гэту прапазыку ў Лёндан сваей радзе, якая большасьцю галасоў адхіліла гэту прапазыку.

Ненадзёжнае сялянства.

На паседжаньні сэкцыі па радаваму будаўніцтву ў вёсцы пры Ц. І. К. К. П. Калінін указаў на рэзкую перамену адносін сялян да камуністычнай партыі і яе прадстаўнікоў, працуючых у сельскіх радавых інстытуцыях. Па зданьню камітэта гэты зварот у настроі сялянства зьяўляецца вынікам, апрача разьвіваючайся ў вёсцы контр-бальшавіцкай прапаганды, яшчэ і слабасьцю радава-партыйных апаратаў.

ТРОЦКАГА і ЗІНОЎЯВА ВЫГНАЛІ З КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ.

Цэнтралны выканаўчы камітэт расейскай камуністычнай партыі пастанавіў выключыць Троцкага і Зіноўява з ліку сябраў камуністычнай партыі.

ПАЛЯЦЬ.

Лічба пажараў, паўстаўшых дзякуючы падпалам, на тэрэні радавай Украіны расьце з страшнаю шпаркасьцю. Ад паловы траўня да паловы чэрвеня толькі у аднэй Экатэрынаслаўскай губ. было больш 100 вялікіх пажараў. Падпаляліся галоўным чынам будынкі, у які месьціліся рожныя радавыя інстытуцыі. Агулам у працягу 4 апошніх месяцаў у Экатэрынаслаўскай губ. было каля 340 пажараў. У гэтым стопні павялічываюцца і замахі на цягнікі з мэтай выклікаць катастрофы.

Мардуюць.

У Уладзімірской губ. на фабрыцэ „Чырвоны Профінтэрн" работнік Мелькоў замардаваў сэкрэтара месцовага акружнага камітэту комуністычнай партыі Блесмана. Забойца заявіў, што замардаваў Блесмана, як агэнта Г. П. У.

І у Маскве страляюць.

На старшыню маскоўскага ваеннага суда зроблены замах у гмаху суда. Было зроблена ў яго некалькі выстралаў з рэвальвэру, у выніку чаго ён быў ранен. Віноўны арыштаваны.

АРЫШТЫ КАВЭРДАУ У УСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

На загаду рады народных камісараў Усх. Беларусі арыштаваны усе асобы з фаміліяй Каверды. Каля Менска арыштавана адна семья, у Барысаве — дзьве сям'і Кавэрдаў. Арыштаваныя дастаўлены ў Менск і пасаджаны ў турму Г. П. У.

Апошнія навіны.

З ПОЛЬШЧЫ.

СОИМ.

На надзвычайным паседжаньні Сойма сацыялісты ўнясьлі прапазыку аб самароспуску Сойма. Паводле гэтай прапазыкі „Сойм можа быць распушчаны на аснове сваей пастановы, прынятай большасьцю двух трэціх галасоў пры палічы прынамся паловы законнага ліку паслоў і вызначыць час новых выбараў. Прэзыдэнт Рэспублікі мае права распусьціць сойм пры згодзе трох пятых законнаго ліку сэнатараў. У абодвых выпадках распускаецца і сэнат. Прапазыка аб роспуску сойму павінна быць падпісана прынамсі адною трэцяю часткаю законнага ліку паслоў і унесена за тыдзень да паседжаньня на якім гэта прапазыка будзе абгаварывацца". Пасьля трэцяга чытаньня гэта прапазыка была прынята 189 галасамі проці 10. Гэткім чынам Сойм можа сам сябе распусьціць, калі захоча.

АСТАНКІ ЮЛЬЯНА СЛАВАЦКАГА НА БАЦЬКАУШЧЫНЕ.

Астанкі вялікага польскага поэты і барацьбіта за уваскрашэньне, вольнасьць і незалежнасць свайй бацькаўшчыны прыбылі на родную зямлю, Пасьля кароткай астаноўкі ў Варшаве яны, з вялікімі урачыстасьцямі, былі адвезяны да Кракава, дзе знайдуць вечны супакой ў быўшым каралеўскім палацу побач з астанкамі Адама Міцкевіча.

Ахвяры для Барыса Кавэрды.

Некатарыя зарубежныя, расейскія, эміграцкія газэты адкрылі на сваіх шпальтах прыймо ахвяраў для Барыса Кавэрды і яго сям'і. Ахвяры гэтыя з кожным днём наплываюць у значным ліку. Гэтак, напрыклад да рэдакцыі газ. „Возрожденіе" у Парыжы ў працягу некалькіх дзён да 21 чэрвеня паступіла 2,753 франц. франкі, да рэд. „Нового Времени" ў Белградзе да 22 чэрвеня — 3,090 дінараў і 315 франкаў; рэдакцыя газ. „Русь" у Сафіі (Баўгарыя) да 22 чэрвеня атрымала 3,555 лв. і г. д.

З ЗАГРАНІЦЫ.

Ліквідацыя альбанска-сэрбскага канфлікту.

На мінуўшым тыдні пасланнікі Англіі, Францыі, Італіі і Нямеччыны ў Белградзе даручылі сэрбскаму ўраду паасобныя, але аднолькавыя ноты, жадаючыя, каб канфлікт з Альбаніяй, выкліканы арыштам сябра сэрбскага пасольства у Альбаніі, быў зліквідаваны такім чынам, што звальненьне Дзюрасковіча наступіць аднача сна з зьменай выразаў у сэрбскай ноце, якія албанскі ўрад лічыў для сябе абражаючымі. З аналёгічнымі жаданьнямі выступілі прадстаўнікі вышэй паказаных дзяржаваў перад албанскім урадам. Як сэрбскі, гэтак сама і албанскі ўрад згадзіліся на гэтыя прапазыкі. Гэткім чынам албанска-сэрбскі канфлікт можна лічыць зліквідаваным.

НОВЫ КАБІНЭТ У РУМЫНІІ.

У Румыніі стварыўся новы кабінэт, на чале якога стаіць кіраўнік румынскай лібэральнай партыі Ян Братыяну.

АДМЕНА СВАБОДЫ ЗАБАСТОВАК У АНГЛІІ.

Англійская Ніжэйшая палата прыняла большасьцю 354 гал. проці 139 у трэцім чытаньні закон аб абмежаваньні свабоды прафэсыянальных саюзаў і права забастовак. Паводле новага закону ўсе забастоўкі прызнаюцца нелегальнымі і падляжаць наказаньню. Роўным чынам забараняюцца усякія зборы ахвяраў на забастовачныя меры.

мецка-бальшавіцкіх інтрыг і шантажу. Гэтая прамова павінна атразьвіць трохі нямецкіх палітыкаў і прымусіць больш паважна задумацца над далейшым кірункам нямецкай палітыкі. Прамова Цуанкарэ аднімае ўсякую магчымасьць для немцаў іграць на праціварэччах між Лёнданам і Парыжам. Дзякуючы такой рашучай пазыцыі Францыі і гэтчас Англіі будзе мець большую вагу ў эўрапэйскай палітыцы.

Наагул трэба адзначыць значнае узмацненьне фронту вялікай Антанты, чаму ў значнай меры спрыяла ліквідацыя сэрбска-албанскага канфлікту, наступіўшая ў выніку калектыўнай інтэрвэнцыі прадстаўнікоў Англіі, Францыі, Італіі і Нямеччыны ў Белградзе і Скутары. Цяпер пакуль няма ніякага воблачка на палітычным гарызонце Заходняй Эўропы, якое-бы магло даваць на дзею немцам і бальшавікам на магчымасьць выклікаць якую-небудзь буру. А мір і згода між эўрапэйскімі дзяржавамі, гэта сьмерць для бальшавікоў і нямецка-бальшавіцкай дружбы.

N.

V. „Дванаццаць" — поэма А. Блока; пераклаў І. Гудок.

Вялікі поэт маскоўскі, тонкі імпрэсыаніст і сымбаліст — Аляксандар Блок, пад уплывам кастрычнікавае рэвалюцыі у Расеі, напісаў сваю вядомую поэму *„Дванаццаць"*.

Ў рэвалюцыйнай поэме гэтай, у якой імглісты містыцызм пераблутаны з самым яскравым натуралізмам, шмат ёсьць мейсцаў вульгарных, б'ючых па нэрвам, у чым ўрэшце няма вялікага дзіва, калі возьмем пад увагу, што тэмай твору ёсьць „смутная пара" пачаткаў рэвалюцыі, а гэроямі яго — падонкі грамадзянства, прыпадкова вынесеныя на паверх жыцьця мутнай хваляй соцыяльнага пераваротy.

Погляды крытыкі на ідэалёгію гэтага твору ёсьць вельмі супярэчнымі, але незалежна ад таго, ці гэта мае быць апотэоз рэвалюцыі, ці сатыра на яе, трэба будзе прызнаць *„Дванаццаць"* прадусім за плод нэрвовага растрою кволай душы расейскага інтэлігэнта, за адчайную спробу прытарнавацца неяк да новых, рэвалюцыйных абставін жыцьця і творчасьці. Спроба гэта, ўдаўшаяся поэту ў літэратуры, ў жыцьці, — як ведама закончылася катастрофай, — перадчаснай сьмерцяй аўтара, ня вытрымаўшага „прынадаў" бальшавіцкага рэжыму!...

І гэту *спэцыяльна-расейскую і зусім чужую беларускаму народу*, вульгарную, рэвалюцыйную поэму „прыпаднёс" нашаму грамадзянству І. Гудок!

У першы момант трудна зразумець да чаго ён гэтым імкнуўся, але калі успомнім, што перад выхадам гэтага перакладу асобнай кніжкай „грамадаўцы" з вялікім захапленьнем друкавалі яго у сваёй „Маланцы" дык справа робіцца яснай! —

Гэта-ж — рэвалюцыйны твор, не абыякое, пропагандное срэдства", а ім-жа „грамадаўцам" толькі гэтага і трэба! Бо вось толькі паслухайце, напрыклад перасьцярогу „буржуям":

„... Гэй, замкайце этажы,
„Сёньня будуць грабяжы!
„Склепы насьцеж адмыкай —
„Гэй, галота, гэй — гуляй!..."

Гэта-ж быццам адрывак з партыйнай праграмы! Малюнак поўнага ажыцьцяўленьня грамадаўскіх „ідэалаў"!

А гэткіх абразоў бальшавіцкага „раю" ў поэме поўна!.. Дык паўтараем, няма дзіва! Што датыча самога перакладу, дык зроблены ён наогул *даволі добра*, але зусім непатрэбна зьбеларушчыў І Гудок у сваім перакладзе характэрныя, маскоўскія імёны арыгіналу і мо' зрабіў ён гэта ў мэтах прыбліжэньня твору да беларускіх народных масаў? — ня ведаем! — у кожным выпадку думка рашуча ня ўдалая! Кіруючысь мэтадам п. Гудка трэба было-б, перакладаючы *„Пана Тадэуша"* на расейскую мову пісаць не „Пан Тадэуш", а „Господин Фадей"!!

Выдана кніжачка (29 старонак павялічанай 16-ткі) — старанна і хораша ды-й упрыгожана футурыстычнымі ілюстрацыямі, ўзятымі з расейскага выданьня.

VI. „Бартэк пераможнік" — Г. Сенкевіча;

пераклаў М. Краўцоў.

Талентны твор вядомага польскага пісьменьніка — новэлла *„Бартэк пераможнік"*, перакладзеная на шмат якія чужацкія мовы, дачакала ўрэшце і беларускага выданьня! Твор гэты для беларусоў тым больш цэнны, што у ім можна знайсьці не мала аналёгіяў з адносінамі, іствуючымі на беларускіх землях.

Пераклаўшы новэллу М. Краўцоў, які ўжо вядомы сваімі ранейшымі перакладамі *„Алесі"* — Купрына і папулярнага нарысу сусьветнае гісторы п. н. *„Вялікія падзеі рожных часоў і народаў"*.

Пераклад „Бартка пераможніка" зроблены добра, ўмела; выданьне кніжкі, абыймаючай ажно 83 старонкі палепшанай васьмёркі — акуратнае; вокладка — салідная; карэкта — старанная. Гэты-ж перакладчык зьмясьціў са два гады назад, яшчэ у „Грамадзкім Голасе", другую вядомую новэллу Г. Сенкевіча: *„Янка Музыка"*, вось-жа было-б вельмі пажаданым выдаць і гэты пераклад асобнай кніжачкай, злучыўшы яго з іншымі перакладамі М. К. з польскае мовы, якіх друкавалася некалькі у вышэйазначанай газэце.

VII. "Ня розумам сьцяміў, а сэрцам"— п'еса ў 4 актах К. Васёлага 48 ст. in octo.

П'еса з вясковa жыцьця *„Ня розумам сьцяміў, а сэрцам"*, належыць да лепшых твораў „народніцкае пары": яна добра пабудавана; сялянскія тыпы умела апрацаваны, а рэалізм твору паказывае на блізкае знаёмства аўтара з вясковым бытам. Аўтар яе К. Васёлы (сапраўднае прозьвішча — Вінцук Аўдзей) — заслугоўвае на даволі пачэснае мейсца ў беларускай літэратуры, а ў сэнсе ідэйнасьці і адраджэнскага захапленьня, бязсумліўна выпяраджае гэткіх пісьменнікаў, як Арлоўскі, а на'т Пшчолка! Можна шчыра павіншаваць выдаўца П. Мятлу з выданьнем гэтай п'ескі асобнай кніжкай, якое у немалой ступені прыложыцца да яе папулярызацыі сярод шырэйшых колаў грамадзянства (дасюль друкавалася яна толькі ў газэтах). На спэцыяльную пахвалу заслугоўвае зьмешчаная у перадзе прадмова інформацыйнага характару, апрацаваная праз д-ра І. Дварчаніна, пад рэдакцыяй якога выдавалася кніжка. Гэткая прадмова, зьмяшчаючая у сабе біографічны матэр'ял (на жаль вельмі скупы!) аб аўтару п'есы, ды й крытычныя увагі адносна самага твору, ёсьць вельмі карыснай і пажаданай з боку узгадаваўчага і добра было-б, каб іншыя беларускія выдаўцы скарысталі з добрага прыкладу.

VIII. „Wybary starszyni" — п'еса ў 3 дзеях Янкі Быліны.

Выдана кніжка (24 старонкі паменшанай васьмёркі „Biełaruskaj Krynicaj" даволі такі скромна; асабліва вокладка зусім неважная. Аўтар яе — Я. Быліна, другарадны беларускі пісьменнік, вядомы шырэйшай публіцы сваім папулярным зборнічкам вершаў п. н „Na pryźbie", які прычакаў ўжо другога выданьня.

„Выбары старшыні" ёдаць зьяўляюцца першай спробай драматыцкае, сцэнічнае творчасьці аўтара

Конструкцыя п'ескі прымітыўная; тэма— выдала замуж за нямілога старога — шаблонная але апрацоўка вясковых тыпаў—добрая і шмат здаровага гумару і забаўных сытуацыяў.

Аўтар назваў свой твор ажно „трагікамэдыяй" але назоў гэты лішне ўжо урачысты, як для гэтакай нескамплікаванай штучкі які паводле сьцiслых літэратурных нормаў можа быць акрэсьлены толькі як, папулярная, народная п'еска з мелёдраматычным зьместам, адпаведная для аматорскіх сцэн на вёсцы.

Гэтым канчаем агляд віленскіх беларускіх, літэратурных навінак 1926 году.

ЯЗЭП СЬВЕТАЗАР.

Канец.

Пашырайце роднае слова!

Тутэйшая хроніка.

— УРАЧЫСТАСЬЦЬ КАРАНАЦЫІ АБРАЗА МАЦІ БОЖАЙ ВАСТРАБРАМСКАЙ. 2 ліпня ад будзецца ўрачыстасьць каранацыі Цудоўнага абраза Маці Божай Вастрабрамскай. На гэтую ўрачыстасьць прыбудзе з усіх канцоў Польшчы шмат рожных дэлегацыяў, і некалькі дзесяткаў тысячаў багамольцаў. Прыймуць удзел польскія архіяпіскапы ўсіх парафіяў. У пятніцу а 8 г. вечара прыедзе да Вільні Прэзыдэнт Рэспублікі Масьціцкі ў саправаджэньні сябраў Ураду. Апрача гэтага прыбудуць заграпічныя паслаанікі Амэрыкі, Францыі, Англіі, Італіі, Іспаніі і інш.

— ВЫЕЗД п. ВАЯВОДЫ РАЧКЕВІЧА. 27-го чэрвеня п. Ваявода Рачкевіч выехаў на інспэкцыю некатарых гмінаў Віленска-Троцкага паветаў.

— МАСТАЦКАЯ ВЫСТАЎКА. У салі Віленскай Беларускай Гімназіі (Астрабрамская 9) адкрылася мастацкая выстаўка прац вучняў мастацкіх працоўняў Віленскай і Радашкоўскай Беларускіх гімназіяў з удзелам іх кіраўніка Я. Драздовіча. Выстаўка адкрыта да 5 ліпня кожны дзень ад 12 гадзіны да 7 вечара.

— СОЎНЕЧНАЕ ЗАЦЬМЕНЬНЕ. Сяньня будзе прыметна па цэлым абшары Польшчы соўнечнае зацьменьне. У Вільні пачнецца а 5 г. 24 м. рана.

ШВЭЙЦАРЫЯ ПРОЦІ ПРЫЗНАНЬНЯ РАДАВАГА УРАДА.

На паседжаньні Нацыянальнай Рады швэйцарскі прэзыдэнт рэспублікі Матта, адказаў на запытаньне аб адносінах да радавай рэспублікі, што ў сучаснай сытуацыі швэйцарскі ўрад ёсьць далёкі ад замераў прызнаць радавы ўрад.

Барацьба з бальшавіцкімі уплывамі у Кітаі.

Быўшы раней Радавым прыхільнікам кітайскі гэнэрал Фэнг, знаходзячыся цяпер у Кайкінскага дыктатара Кай-Шэка, заявіў амэрыканскім журналістам, што выслаў ханькоўскаму камуністычнаму ўраду тэлеграму з жаданьнем безадкладнага высяленьня бальшавіцкага эмісара Барадзіна. Маею мэтаю — заявіў Фэнг — зьяўляецца аб'еднаньне ўсіх кітайскіх партыяў на падставе праграмы Сун-Ят-Сэна з выключэньнем усіх вонкавых уплываў, асабліва камуністычных

З Усходняй Беларусі.

НАПАД БАНДЫТАУ НА ЦЯГНІК У РАДАВАИ БЕЛАРУСІ.

Паміж Менскам і Смаленскам былі раскручаны жалезна-дарожныя рэльсы на вялікім працягу. Цягнік узашоў поўным ходам на сапсуты вучастак дарогі і зваліўся з высокай насыпі. У гэты момэнт на цягнік напала група бандытаў, якія выцягівалі з разьбіўшыхся вагонаў раненых пасажыраў і грабілі іх.

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Страшны гураган.

24 чэрвеня на канфэрэнцыі прэсы ў міністэрстве ўнутраных справаў Навагрудзкі ваявода п Бечковіч прадставіў сабраўшымся страшныя вынікі стыхійнага бедства, якое ў кшталце нябывалага гураганy,ваздушнага сьмерчу і граду прайшло праз Навагрудзкае ваяводзтва, зьнішчыўшы ўсё на сваім шляху ў пяці паветах. 12 чэрвеня бура прайшла праз слонімскі павет, а 14 чэрвеня праз Навагрудзкі, кіруючысь на Усход.

Найбольш пацярпелі два паветы, дзе бура была разам з градам. Страты ў людзях складаюць 6 асобаў забітых і 9 раненых. Лічба іх была-бы значна большая калі-б гэты гураган прайшоў не ў паўднёвых гадзінах, калі, як людзі, гэтак сама і жывёла, знаходзіліся ў полі. Зьнішчана 283 будоўлі, з якіх 271 жылых, 10 школаў і 2 царквы.

На прасторы 10,000 гэктараў зьнішчаны ў 100 проц. азімыя засевы і 40 проц яровыя. Лес на прасторы 600 гэктараў вывараčаны Для характэрыстыкі шалеўшага ветру ваявода ўказаў на факт, што ў Стаўпецкім павеце быў перанесяны на 300 мэтраў камень вагаю ў 300 кілагр. і хлапец, які заплаціў з гэту ваздушную п дарожу св ім жыцьцём

Каб падняць упаўшы дух насяленьня пацярпеўшых мест, п. ваявода і старосты абяцалі прыйсьці з пасільнай запамогаю, якая будзе ісьці ў трох кірунках: адбудове, засеву, і заработку. Да гэтага часу ваявода атрымаў ад міністра Незабытоўскага 400,000 зл. і абяцанку далейшых 200,000 зл, якія дадуць магчымасьць купіць зярна і засеяць зьнішчаныя палі тым, што яшчэ можна сеяць. Для адбудовы, апрача ляснога матэр'ялу, які можна атрымаць з зьнішчаных лясоў, патрэба ня меньш мільёну зл. гатоўкаю. Апрача гэтага п. ваявода атрымаў ад мін. працы Марачэўска абяцанку, што з сумаў, вызначаных на будову дарогаў, значная частка будзе вызначана для Навагрудзкага ваяводзтва, каб даць працу пацярпеўшаму насяленьню.

Агульная сума стратаў, ня лічачы збожжа на пню дасягае 5 міл зл.

„ЧЫ ВАРТА БЫЛО ВЕРЫЦЬ БРАХУНАМ—СЕЛЬСАЮЗА“

Будучы прошлай нядзеляй ў вёсцы В. у знаёмага чалавека, я выпадкова угледзіў на стале газэтку „Сялянская Ніва“, орган Белар Сял Саюзу. У часе гутаркі выйшла тое, што знаёмый мой і яго суседзі атрымліваюць зусім дарма гэту газэтку і сьмяюцца, што ёсьць на сьвеце такія дурні, быццам дабрадзеі, якія вучаць не працай і чпатай дабываць чалавеку хлеб — газэтку, а даюць проста „дармошку.

Гэтай „дармовай“ справай я заінтэрэсаваўся і дайшоў да рэзультату, што на 31 „падпісчыкаў“—толькі 2 (даслоўна два!) чалавека прасілі рэдак. „Сял Нівы“ высылаць ім газэту, а 29 ніколі не мелі нават думкі пісаць, каб прысылалі дарма—і няведама адкуль рэдакцыя „С. Нівы“ ўзяла іхнія прозьвішчы і адрэсы і ужо 1½ года высылае дарма газэту.

„Поў-казённы рэдактар „Нівы“—ў № 42 ад 19 траўня г г. ў „нашай пошце“ даслоўна піша: „Дзеля неаплаты падпіскі ад 1 VI 27 г. спыняем высылку газэты грам .. (Есьць блізка поў сотні прозьвішчаў тых людзей, ямім дарма высылалі „С. Ніву“ і якія ніколі не прасілі высылаць ім!)

Цікава ведаць: 1) адкуль „Саюзьнікі“ бяруць столькі грошаў, што на некалькі гмінаў у нашам павеце шлюць дарма, не будучы прошаны аб гэтым, сваю Ярэмічаўскую „Брахліў Ніву“

2). Чаму гэта зіц-рэдакт. ня памяшчае ў сваей газэтцы цікавых для вёскі, гаспадарчай натуры, вестак, — а толькі ў кожным нумары лье бруд то на Луцкевіча,—то зн ў на Паўлюкевіча і так заўсёды? Дакуль-жа гэта будзе?

З гэтай „С. Нівы“ добра відаць, што галава рэд.—выдаўца ёсьць надта вялікай памойніцай,— з якай дагэтуль ня можа выліцца ўвесь бруд на шпальты газэцінкі... А пара даўно!!

Радзім пісаку (адказн. рэдакт.) пайсьці ў „малудоулю“ і там няхай ягоныя калегі выймуць з галавы ўвесь смрод...

Прэч з Ярэмічаўскім брудам! Чыстага паветра трэба!

Сланоў.

„ЧЫ ГЭТА ЛЕГІЧНА?“

(*Вынятак з мазгаў Гагулі*)

„Сял Ніва“ ад 19. V. 27 г. № 42 стр. 4 даслоўна: „Ад Рэдакцыі“ (Сяль. Нівы“) Л. Міцько б. рэдактар „Сял. Нівы“ сябрам Сялянскаго Саюзу ніколі ня быў, а дзеля гэтага яго пісьмы аб выхадзе з сябраў Сял Саюзу не адпавядаюць праўдзе..

„Сял. Ніва“ ад 15 VI. 27 г. № 47 стр. 3 даслоўна: Міцька б. адказны рэдактар „Сял. Нівы“ зьмясьціў пісьмо, якім зноў цьвердзіць, што быў сябрам Сялянск. Саюзу, З прычыны гэтага, зноў падаем да агульнага ведама, што Л. Міцько сябрам Сел. Саюзу ніколі ня быў“...

Бедныя Сельсаюзьніцкія мазгі! Бедная „Брахлівая партыя Ярэміча“ і яго наймітаў! Проста і яўна я, жыхар вёскі Збегна, Чамерскае гміны, Слонімск. павету, кажу вам „філёзофы“:

1) Калі б. рэдактар „Сял. Нівы“, органу Б. С. С. Л. Міцька ня быў нават сябрам Саюзу, дык вы, брахуны, думаеце нас—вяскоўцаў туды злавіць? Не, браткі, прайшла пара.

2) Мы ня верым, што магло так быць, каб адказны рэдакт. начальн. органу ня быў сябрам партыі? Хто-ж тады, будзе!

Вашы шэрэнгі былі, ёсьць і будуць пустыя, калі нават сам рэдактар не хацеў належыць да Сельсаюза,—бо добра ведаў, што гэта толькі бруд і нябошчык маральны ў вачох беларуск. грамадзянства!

Адначасова больш прошу вашай газэткі - гнілі, якая прыходзе няпрошанай ў Озерніцу не высылаць мне.

Б. Л.

„Дайце роднае слова.“

Газэты „Exspress Poranny“ і „Kurjer Czerwony“ з дня 1 чэрвеня г. г. падаюць вестку, што „саюз абароны крэсаў заходніх“ на чале з п. ваявадзінаю Сальтановаю прыступіў да заргаізаваньня калёніяў летніх для 12 000 польскіх дзяцей з Нямеччыны і Гданьска. Дык вось п. ваяводзіна разам з п. Прэзыдэнтоваю Масьціцкаю арганізуюць летніска для тых дзяцей, бацькі якіх падчас нашэствія бальшавіцкай арды у 1919 і 1820 г. ня приймалі нават удзелу для абароны Польшчы. А тых дзяцей бацькі каторых шчыра нясьлі свае жыцьцё на алтар бога вайны у барацьбе за незалежнасьць Польшчы, кроўю каторых так шчыра зрошаны палі Віленшчыны, Наваградчыны і іншыя, ніхто ня зьвертае ўвагі.

Дома ў бацькі — ваякі 2 3 дзясяціны земліцы—пяску, або балота, дзетак 6—8,—усе аборваныя, голыя, босыя, галодныя, хата—гэта вайсковая зямлянка, дзе вечна пануе сырасьць і трымаюцца заразныя хваробы. . Гэтыя дзеці ня толькі ня могуць лятуцець аб лётнісках, але ня маюць нават хлеба кавалка, ня могуць купіць лямантарык да школкі, бо ў бацькоў забіраюць падушкі і кароўку—карміліцу за падаткі.

Дык сьвятым абавязкам ёсьць для тых, каму дорага дабро цэлага народу, зьвярнуць увагу на палепшаньне быту тых маленькіх сялян, браты, бацькі каторых, а нават і яны самі будуць падчас патрэбы першымі нясьці сваё маладое жыцьцё для абароны усходніх граніцаў Польшчы І замест арганізаваньня калёніяў для якіх небудзь дзяцей з Нямеччыны за слёзныя грошы адпадаткаў, за праданыя падушкі, кароўкі і г. д павінны паруніцца даць дзіцяці Беларуса—сяляніна—ня многа—хаця кніжку для навукі, каб працерці яго вочкі, навучыць, як жыць на сьвеце і паказаць ім іх мінуўшчыну і будучыню у межах іх бацькаўшчыны —Польшчы.

Юрка з Пугачоў.

Слонімская хроніка.

1) У м. Слоніме ўлада пачала будаваць новы, каменны мост. У сувязі з гэтым шмат безработчых знайшло працу. Можна сьмела сказаць, што ў Слоніме цяпер ёсьць толькі малая часьціна безработных.

2). 31 V. 27 г. Акружны суд у Горадні, на судавой сэсіі ў Слоніме разглядаў справу „67“ камуністаў, абвінавач са 102 ст. К.К. Паміж іншымі, ёсьць засуджаны Сым н Руды, на 4 гады цяжкай турмы.

3). 13. VI 27 г. пачалась ў Слоніме разглядацца справа „51“ комуністычных хул ганаў, якія за маскоўскія чырвонцы прадавалі душу Белар Народу.

4). 14 VI. 27 г. прыехаў да Слоніма з „Абман Саюза“—пасол Ярэміч. Мэта прыезда „Вялікага палітыка“— даць паказаньня на судзе, як сьведка ў працэсс „51“

Паміж іншым Ярэміч доўгі час гутарыў з лідэрам „Вызваленьня“—адвакат. Валадковічам.

5). Навагрaдзкі ваявода апошняй нядзеляй асыгнаваў на Слонімскі павет 90,000 залат. крэдыта для падтрыманьня земляробства. Паасобна д сталі: Міжавіцкая гміна — 7,000 зл., Чамерская — 7,000 зл., Жыравіцкая — 8,000 зл., і г. д.

Жыхары, якія жадаюць ўзяць пазыку, павінны зварачвацца да „Kasy Spółdzielczej“ сваёй гміны.

6). 16. VI. 27 г. адбыліся выбары да „Rady Gminnej“ ў наступн. гмінах: Чамерскай, Шыдлавіцкай, Дзяравенскай, Рагацянскай і ў Казлоўшчыне.

7). 19. VI. г. г. — ў Міжавіцкай, Девятковскай, Жыравіцкай, Бытэнскай і інш.

Узгадаваньне духавенства.

Аднэй з найважнейшых падставаў жыцьця кожнага народу ёсьць ягоная вера, рэлігія. Няма народу бяз веры. Але бываюць народы з вераю падупалаю і тады бачым, што настае ў такога народу дэмаралізацыя і адначасна хістаньне грамадзкага і дзяржаўнага парадку. Дзеля гэтага тыя, чыім заданьнем ёсьць рабіць на ўсім сьвеце непарадак, стараюцца зруйнаваць рэлігію Мы бачым, што з рэлігіяй і яе арганізацыяй — царквою сыстэматычна змагаюцца бальшавікі. У нас у Заходняй Беларусі апрача бальшавікоў у гэтым кірунку прабавала выступаць „Грамада“.

Ведаючы добра значэньне рэлігіі і царквы ў жыцьці народу і дзяржавы „Беларуская Нацыянальная Рада“ заўсёды мела на увазе падтрыманьне і добрае разьвіцьце Праваслаўнае Царквы ў Заходняй Беларусі А наша газэта адным з лёзунгаў на сваім штандары напісала „Нацыянальная Царква“ Добра сказана у нашым лёзунгу „Нацыянальная *Царква*“ бо хаця вера інтэрнацыянальная, але царква, як арганізацыя, дзеля ўжыцьцяўленьня канкрэтных заданьняў веры мусіць быць нацыянальнаю, бо людзі — матэр'ял, над якім яна працуе, заўсёды належаць да тае, ці іншае нацыі.

Але, каб Царква была добра арганізавана, каб яна спаўняла свае духоўныя павіннасьці, трэба да гэтага адпаведна прыгатаванае духавенства, бо яно-ж праўдзе заданьні Царквы ў жыцьцё.

Як-жа у нас стаіць справа з узгадаваньнем духавенства?

На жаль, з гэтым у нас надзвычайна блага. Каб узгадаваць праваслаўнае духавенства, патрэбна Праваслаўная Духоўная Сэмінарыя, а ў нас вось ужо некалькі гадоў, як гэтае сэмінарыі нямашака, бо „сэмінарыя“ ці гімназія „духоўная“ у Вільні надта мала прыпамінае сабой Праваслаўную Духоўную Сэмінарыю. Гэта барджэй якясь карыкатура на Духоўную Сэмінарыю, чымся сама сэмінарыя. Усе мы ведаем, што нашыя сэмінарысты гадуюцца вельмі мала па духоўнаму. І гэта зусім зразумела, бо духоўнае узгадаваньне могуць даць толькі людзі духоўныя, а тым часам Праваслаўнай Духоўнай Сэмінарыяй у Вільні кіруе сьвецкая ўлада, а ўлада духоўная мае толькі нагляд у асобе рэктара над духоўным узгадаваньнем сэмінарыстаў. Дзіва яшчэ, што пры гэткіх парадках асталося у нашай Праваслаўнай Сэмінарыі гэтулькі духоўнага, колькі ў ёй яшчэ ёсьць цяпер. Прадстаўце сабе, што сталася-б з каталіцкай духоўнай сэмінарыяй, каб ў ёй завясьці падобныя парадкі. Ведама, што каталіцкая царква ніколі на гэта не згадзілася-б, ня гледзячы на тое, што сьвецкая ўлада тут была тае-ж самае каталіцкае веры.

Дзеля вышэйсказанага трэба горача прывітаць, калі, нарэшце праваслаўнае духавенства гэтак сама зразумела і Сьвяцейшы Сынод Праваслаўнай Аўтокефальнай Царквы у Польшчы нядаўна пастанавіў зрэформаваць Праслаўную Духоўную Сэмінарыю у Вільні па прыкладу Праваслаўнай Сэмінарыі ў Крэмянцы. У Крэмянцы Праваслаўную Сэмінарыю вядзе духоўная улада і ўвесь парадак вельмі прыбліжаны да старых духоўных сэмінарыяў, калі яны былі запраўды духоўнымі. Расейскую мову, ведама, заступілі родная, там украінская мова, на каторай выкладаецца палова прадметаў, а другая палова па польску. Трэба спадзявацца, што гэтая пастанова Сьвяцейшага Сыноду будзе спагадна прынята Міністэрствам Вераў і Публічнае Асьветы.

Духоўныя Сэмінарыі, пазбаўленыя духоўнага аблічча, адпіхаюць ад царквы народ. прычыняецца да пашырэньня ў ім бязвер'я і розных заграпічных сэктаў, што усё зьяўляецца адпаведнай атмосфэрай дзеля пашырэньня бальшавіцкіх і іншых уплываў, у той час, як зварот сэмінарыі яе духоўнага аблічча і прыбліжэньне яе, а тым самым і усяго прасваслаўнага духавенства, да мясцовага, беларускага народу прычыніцца да аздараўленьня рэлігійных адносінаў на крэсах. Ня можна не зьвярнуць увагі на тое, што „Грамада“ была захапіўшу мноства праваслаўных, але беларусаў, каталікоў яна толькі зачапіла, бо каталіцкае і асабліва беларускае каталіцкае духавенства не адарвана ад сваіх верных. Дзеля гэтага такжа беларускае праваслаўнае грамадзянства і ўвесь народ павінны горача прывітаць і падтрымаць пастанову Сьвяцейшага Сыноду.

Праваслаўны.

Паштовая скрынка

Высоцкаму — Стаўпцы. „Досьвіткі і 2 эгз. „Скарб“ Васілеўскага 22 — VI г. г. выслалі.

Пецюкевічу — Радашкавічы Два эгз. „Досьвіткі“ 22 — VI г. г. выслалі. Просім аб найскарэйшай высылцы грошаў.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мостовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.